# Паважаныя калегі!

УА «Віцебская ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны» 21-22 мая 2015 года праводзіць IV Рэспубліканскую навукова-практычную канферэнцыю навучэнцаў аграрных каледжаў **«Моладзь Беларусі – іннавацыйнаму развіццю АПК».** Канферэнцыя праводзіцца ў рамках 100-й Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі студэнтаў і магістрантаў **«Студэнты – навуцы і практыцы АПК».**

*21 мая – дзень заезду*
*22 мая – работа секцый*

*Работа канферэнцыі будзе праўдзіцца па наступных напрамках:*

1) **Ветэрынарная медыцына;**
2) **Заатэхнія, агранамія і ахова раслін;**
3) **Механізацыя і аўтаматызацыя сельскай гаспадаркі;**
4) **Эканоміка АПК.**

Рабочыя мовы канферэнцыі – беларуская, руская.
Лепшыя матэрыялы будуць надрукаваныя у тэзісах 100-й Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі студэнтаў і магістрантаў **«Студэнты – навуцы і практыцы АПК».** Публікацыя тэзісаў бясплатная.

Для ўдзелу ў рабоце канферэнцыі неабходна накіраваць на адрас акадэміі да **30 красавіка 2015 г**. наступныя матэрыялы:

- заяўку на ўдзел у канферэнцыі*;
- тэзіс на папяровым носьбіце, падпісаны аўтарам і яго навуковым кіраўніком і афармлены згодна з патрабаваннямі**;
- электронны варыянт тэзіса (прымаецца толькі па электроннай пошце (*прыклад назвы файла «Смілавіцкі ГАК – Пятроў П. П.» (прозвішча і ініцыялы першага аўтара)).*

Тэзісы ў выглядзе файлаў ад адной навучальнай установы павінны быць прадстаўлены ў адным электронным лісце.

*Патрабаванні да афармлення тэзісаў*. Тэзісы пішуцца на беларускай альбо рускай мовах з аднаго боку ліста фармата А4 (210х297 мм).

Аб'ём - 1 поўная старонка камп'ютарнага набору ў рэдактары Microsoft Word 97 і вышэй, інтэрвал – адзінарны, шрыфт 14, Times New Roman Cyr. Абзацны водступ – 1,25 см. Палі: злева - 30 мм, справа, уверсе, унізе - 20 мм.

Тэкст тэзісаў набіраецца ў наступным парадку: УДК (змяшчаецца ўверсе злева), прозвішча і ініцыялы аўтара і яго навуковага кіраўніка, вучоная ступень і званне навуковага кіраўніка (пры наяўнасці), поўная назва ўстановы адукацыі, горад, краіна, назва тэзіса, тэкст тэзіса. Прозвішча і ініцыялы аўтара і яго навуковага кіраўніка, назва тэзіса набіраюцца вялікімі літарамі, напаўтлустым шрыфтам, выраўноўванне – па левым краі старонкі. Тэкст тэзісу выраўноўваецца па шырыні.

Табліцы, малюнкі, фатаздымкі, графікі, спіс літаратуры ў тэзісах прыводзіць не патрэбна.

Тэкст тэзісаў неабходна дбайна выверыць. Аўтары і іх навуковыя кіраўнікі нясуць персанальную адказнасць за змест і афармленне тэкста.

Адным аўтарам (ці ў сааўтарстве) можа быць прадстаўлена не больш за два тэзісы ў адной секцыі, колькасць сааўтараў у адной рабоце - не больш за пяць. Прадстаўляемыя да ўдзелу ў канферэнцыі матэрыялы павінны ўтрымліваць вынікі ўласных даследванняў. Не прымаюцца тэзісы з інфармацыяй у выглядзе агляда.

**Тэзісы, не адпавядаючыя вышэйпаказаным патрабаванням, навуковаму ўзроўню канферэнцыі, а таксама прадстаўленыя пасля 30 красавіка, разглядацца і друкавацца не будуць.**

*Старшыня канферэнцыі* – **Бялко А. А.,** *прарэктар па НДР*;
*Адказны сакратар канферэнцыі* – **Пятроўскі С.У.,** *намеснік старшыні савета НДРС.*
Матэрыялы для ўдзелу у канферэнцыі дасылаюцца па электроннай пошце: **vitebsk_studkonf2015@tut.by**

Кантактныя тэлефоны:
**(0212) 37-04-42 –** Бялко Аляксандр Аляксандравіч, прарэктар па навуковай рабоце.
**(0212) 53-80-94, 37-26-60** - Пятроўскі Сяргей Уладзіміравіч, адказны за НДРС.

*<u>*Узор афармлення заяўкі на ўдзел у канферэнцыі</u>*

**ЗАЯЎКА**
**на ўдзел у IV Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі навучэнцаў аграрных каледжаў «Моладзь Беларусі – іннавацыйнаму развіццю АПК»**

Назва ўстановы адукацыі___________

| № П П | Прозвішча, імя, імя па бацьку ўдзельніка | Курс, спецыяльнасць | Назва даклада | Кантактны тэлефон, e-mail | Удзел вочны/завочны, неабходнасць у інтэрнаце |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | |

Дырэктар (намеснік дырэктара)____________(Імя, Імя па бацьку, прозвішча)

*<u>**Узор афармлення тэзіса</u>*

УДК 619:614.48:636.934.57
**ПАТАПАВА К. І.,** студэнтка
Навуковы кіраўнік **КЯДРОЎ І. С.,** выкладчык
УА «Аграрны каледж УА ВДАВМ»
в. Лужасна, Віцебскі раён, Віцебская вобласць, Рэспубліка Беларусь
**РАСПАЎСЮДЖВАННЕ РЭСПІРАТОРНЫХ ЗАХВОРВАННЯЎ ВА ЎМОВАХ СВІНАКОМПЛЕКСУ**

Ва ўмовах свінагадоўчых комплексаў шырокае распаўсюджванне маюць рэспіраторныя захворванні…

**МІНІСТЭРСТВА СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ І ХАРЧАВАННЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**Установа адукацыі «Віцебская ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны»**

# IV Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя навучэнцаў аграрных каледжаў «Моладзь Беларусі – іннавацыйнаму развіццю АПК»

**21-22 мая 2015 г.**

**Віцебск 2015**